ПРАЛЕТАРЫІ ЎСІХ КРАІН, ЯДНАЙЦЕСЯ!

# БЕЛАРУСКІ УНІВЕРСІТЭТ

ОРГАН ПАРТКОМА, РЭКТАРАТА, КАМСАМОЛЬСКАГА І ПРАФСАЮЗНЫХ КАМІТЭТАЎ БЕЛАРУСКАГА ОРДЭНА ПРАЦОЎНАГА ЧЫРВОНАГА СЦЯГА ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЕРСІТЭТА ІМЯ У. І. ЛЕНІНА

ГАЗЕТА УЗНАГАРОДЖАНА ГАНАРОВАЙ ГРАМАТАЙ ВЯРХОЎНАГА САВЕТА БССР

1984
21
ЧЭРВЕНЯ
ЧАЦВЕР
№ 22 (1435)

Выходзіць раз у тыдзень

Выдаецца з 1922 года.

## "Беларускі універсітэт" тэлетайп

•Учора • Сёння • Заўтра•

### НА ПЛЕНУМЕ

партыйнага камітэта універсітэта намеснікам сакратара паркома па ідэалагічнай рабоце выбраны дацэнт факультэта журналістыкі А. Г. Слука, які раней працаваў загадчыкам падрыхтоўчага аддзялення.

### ВІНШУЕМ

камсамольскую арганізацыю БДУ імя У. І. Леніна, якая ўзнагароджана Граматай праўлення Савецкага фонду міру. Дыплома Беларускага аддзялення Савецкага фонду міру ўдастоены студэнцкі будаўнічы атрад нашага універсітэта «Расінка». Дзейнасць камандзіра занальнага штаба СБА В. А. Прокашавай адзначана ганаровым значком Беларускага аддзялення Савецкага фонду міру.

**І. УЛАДЗІМІРАЎ.**

### ЗА ВЯЛІКУЮ РАБОТУ

па ваенна-патрыятычнаму выхаванню моладзі граматамі Савецкага камітэта ветэранаў вайны ўзнагароджаны выкладчыкі універсітэта Л. М. Шакун, П. П. Шуба і В. А. Захарава.

**А. ВАЛЬВАЧОЎ.**

### НА ВЫТВОРЧА-АЗНАЯМЛЕНЧУЮ ПРАКТЫКУ

ў БДУ імя У. І. Леніна прыехала група студэнтаў-географаў з Любляны (у рамках дагавора аб супрацоўніцтве паміж Беларускім і Люблянскім (СФРЮ) універсітэтамі). Праграмай практыкі прадугледжана вывучэнне прыроды, эканомікі і гаспадаркі Беларусі, правядзенне палявых геаграфічных даследаванняў на вучэбнай станцыі «Заходняя Бярэзіна», наведванне прыродных аб'ектаў на возеры Нарач і ў іншых раёнах. Студэнты з СФРЮ азнаёмяцца са структурай навуковых і вучэбных падраздзяленняў універсітэта, арганізацыяй вучэбнага працэсу і навукова-даследчай работы студэнтаў, наведаюць кафедры і лабараторыі геаграфічнага факультэта.

Для гасцей з Югаславіі распрацавана шырокая культурная праграма. Яны наведаюць музеі і выстаўкі сталіцы нашай рэспублікі, а таксама мемарыяльны комплекс Хатынь і Курган Славы.

**І. ПІРОЖНІК,**
наменік дэкана геаграфічнага факультэта.

### ТВОРЧЫЯ СУСТРЭЧЫ

з заслужанымі артыстамі РСФСР акцёрамі МХАТа Я. Кіндзінавым і А. Калягіным прайшлі ў актавай зале БДУ імя У. І. Леніна. Акцёры расказалі аб сваіх ролях у тэатры і кіно, аб пошуках свайго героя, падзяліліся планамі на будучае.

**З. МІХНЕВІЧ.**

● ВЕТЭРАНЫ Ў СТРАІ ●

## КАЛІ КАНЧАЕЦЦА ЭКЗАМЕН...

ДЗЕВЯЦЬ ГАДЗІН раніцы. У першакурснікаў чацвёртай групы юрыдычнага факультэта пачынаецца экзамен па гісторыі дзяржавы і права СССР. Прымае яго дацэнт Валянціна Васільеўна Сарокіна. Па тварах студэнтаў, па іх голасу, што часта набірае высокі тон, заўважаеш: хвалююцца. Затое ў аўдыторыі ціха. Першыя чатыры чалавекі рыхтуюцца да адказу.

— Я думаю, што хто-небудзь з вас ужо гатовы,— парушае цішыню мяккі голас Валянціны Васільеўны.— Пара пачынаць.

Да стала падыходзіць дзяўчына, садзіцца.

— Калі ласка!

Валянціна Васільеўна ўважліва слухае першае, другое, трэцяе пытанні. Робіць паметкі.

— На пытанні вы адказвалі добра,— на твары выкладчыцы відаць задаволенасць.— А зараз давайце яшчэ пагутарым.

І Валянціна Васільеўна задае пытанні так, што па адказу на іх можна меркаваць аб падрыхтоўцы студэнта па ўсяму курсу.

У экзаменацыйнай ведамасці паяўляецца першая адзнака «добра», за ёю яшчэ і яшчэ адна. У аўдыторыі ўсталёўваецца сапраўдная творчая атмасфера, у якой ствараюцца невялічкія творы аб гісторыі дзяржавы і права СССР.

— Для мяне ў адказе студэнта ўсё важна: і веды матэрыялу (вядома, гэта галоўнае), і пабудова адказу, яго лагічнасць, завершанасць.

Усім гэтым патрабаванням цалкам адпавядае адказ Іны Мяльянцавай. У яе залікоўцы паяўляецца другая ў гэту сесію адзнака «выдатна». «Выдатна» і ў Аляксандра Маймусава, і ў Аляксандра Бачылы, якому дастаўся... трынаццаты білет.

А вось як ацаніць веды М. Іокшы, не ведала нават сама Валянціна Васільеўна. Глыбіня ведаў, шырыня мыслення — вось галоўнае ў адказе гэтага студэнта.

Яшчэ не хутка закончыцца экзамен, яшчэ шмат задасць пытанняў і пачуе на іх цудоўныя адказы Валянціна Васільеўна, а потым яна будзе пытацца ў самой сябе, чаму ў яе так доўга ідзе экзамен. І яна зноў прыпомніць адказ М. Іокшы. «У гады Вялікай Айчыннай вайны»... Цудоўна адказваў хлопец. Шмат ведае. Так, моладзь павінна шмат ведаць. Калісьці такімі цікаўнымі, поўнымі энтузіязму былі і яны...

Калі Валянціна Сарокіна заканчвала педагагічны тэхнікум, ёй было прыкладна столькі гадоў, колькі зараз яе студэнтам. Якраз у гэты час вельмі не хапала настаўнікаў. І калі камсамол звярнуўся за дапамогай да моладзі, яна, не раздумваючы, па камсамольскай пуцёўцы паехала ў Казахстан. Год работы, цяжкай, складанай. Але маладосць перамагла ўсё. І дамоў у водпуск яна ехала пасталелай, больш сур'ёзнай. Гасцінна 21 чэрвеня яе сустрэў Ленінград. А 22-га пачалася вайна. «На фронт, толькі на фронт!» — вырашыла дзяўчына, але трапіць туды ёй не ўдалося.

**— І я вярнулася на месца сваёй работы. З домам сувязі не было. А калі ў 1942 годзе атрымала пісьмо са страшэннымі звесткамі, што ад голаду памёр бацька, пад Масквой загінуў брат, у жывых няма многіх родных людзей, сказала сабе: «Байцом ад нашай сям'і буду я».**

І потым было яшчэ шмат складанага, многае давялося перажыць, зразумець, усвядоміць, перш чым яна стала санінструктарам першага асобнага гвардзейскага танкавага корпуса, які вызваляў Беларусь.

**— Наперадзе быў Мінск. Мы не ішлі, а рваліся да яго. Паміж Бабруйскам і Асіповічамі спыніліся на кароткі адпачынак. Вораг паявіўся нечакана. Нямецкія войскі ўсімі сіламі хацелі вырвацца з акружэння і натрапілі на наш корпус. Бой быў бязлітасным...**

Колькі салдат выратавала, колькі вярнула да жыцця Валянціна Васільеўна ў гэты дзень! За ўсе дні і ночы вайны...

**— А мяне лёс захоўваў. Зараз становіцца дзіўна самой, як мяне кулі міналі. Перамогу я сустрэла у Мінску. Тут працавала ў партыйных органах. Адначасова вучылася ў педінстытуце, потым у аспірантуры. І вось ужо дваццаць пяць гадоў працую ва універсітэце.**

**Многа гэта ці мала! Як для выкладчыка — гэта многа. Гэта шмат сесій, шмат экзаменаў, рознай іншай работы. А як для студэнта — гэта мала. А студэнткай я ў душы засталася назаўсёды. І калі прымаю экзамен, заўсёды ўяўляю сябе сярод тых юнакоў і дзяўчат, якія хвалюцца за дзвярыма.**

Экзамен у Сарокінай працягваецца доўга. І ці зможа ён скончыцца калі-небудзь? Экзамен на сталасць, грамадзянскасць.

**А. КРАСОЎСКІ.**



З ЧЭРВЕНЯ СПАЎНЯЕЦЦА СОРАК ГАДОЎ З ДНЯ ВЫЗВАЛЕННЯ САВЕЦКАЙ БЕЛАРУСІ АД НЯМЕЦКА-ФАШЫСЦКІХ ЗАХОПНІКАЎ. СА СВЯТАМ ВЫЗВАЛЕННЯ ЦЯБЕ, РЭСПУБЛІКА-ПАРТЫЗАНКА, РЭСПУБЛІКА - ПАДПОЛЬШЧЫЦА, РЭСПУБЛІКА - ФРАНТАВІЧКА! СА СВЯТАМ ЦЯБЕ, АДНОЎЛЕНАЯ З РУІН РУКАМІ ТВАІХ ПРАЦАВІТЫХ СЫНОЎ І ДАЧОК, РОЎНАЯ СЯРОД РОЎНЫХ РЭСПУБЛІК-СЯСЦЁР, КВІТНЕЮЧАЯ І ЗАЎЖДЫ СІНЯВОКАЯ БЕЛАРУСЬ!

ПАМЯЦЬ НАША АБ ВАС, ГЕРОІ ВЯЛІКАЙ АЙЧЫННАЙ,— ВЕЧНАЯ, А ДУМКІ НАШЫ ПРА ТОЕ, КАБ НЕБА ЗАЎСЁДЫ ЗАСТАВАЛАСЯ МІРНЫМ, КАБ СТУДЭНТЫ ВУЧЫЛІСЯ, ХЛЕБАРОБЫ РАСЦІЛІ ШЧОДРЫ КОЛАС, ВЫКЛАДЧЫКІ ЧЫТАЛІ ЛЕКЦЫІ... МЫ—ЗА МІР ВА УСІМ СВЕЦЕ!





*ВА УНІВЕРСІТЭЦЕ прайшоў адзіны палітдзень, прысвечаны 40-годдзю вызвалення Беларусі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў. З вялікай цікавасцю праслухалі студэнты і выкладчыкі фізічнага факультэта выступленні старшыні савета ветэранаў універсітэта І. В. Марчанкі і ўдзельніка вызвалення Мінска загадчыка кафедры педагогікі М. У. Піскунова.*

Фота С. Плыткевіча.

# ІМЕМ ЯГО"

Першай вялікай радасцю быў знойдзены на хвалі дэтэктарнага прыёмніка голас Масквы. Сталі паяўляцца лістоўкі. Гэта значыць горад жыў, горад змагаўся».

Вялікае гора яшчэ больш зблізіла, зрадніла Ніну і Георгія. Часта да сяброў стаў наведвацца Уладзімір Амельянюк, які ў той час ужо быў заняты падпольнай работай. Уладзімір хацеў далучыць да гэтай справы і Георгія. Амельянюк ведаў, як неабходны ў партызанскіх атрадах медыкаменты. Таму і прапанаваў Георгію стаць загадчыкам аптэкі. І адразу атрымаў ад Георгія згоду. Ніна стала ў аптэцы касірам, а Міця Майсееў (таксама студэнт хімфака) — вартаўніком.

...Трэцяга верасня 1941 года пачала працаваць аптэка № 1. Вораг не мог нават западозрыць такой дзёрзкасці — побач з аптэкай размясцілася гестапа. Восень, усю зіму 1941—1942, усю вясну да канца мая сорак другога аптэка была як яўка. Будынак аптэкі складаўся з залы, у якой звычайна ў чаканні лякарства збіралася шмат людзей. Тут жа стаяла і драўляная каса, за якой сядзела Ніна. Яна ўважліва сачыла за ўсім, што адбывалася ў зале. «Сарціравала» доступ людзей да Георгія ў маленькі пакойчык. У кабінеце і падвале ляжалі бланкі пропускаў, пашпартоў і іншыя дакументы падполля, назапашваўся друкарскі шрыфт для адпраўкі ў партызанскія атрады. Часта ў аптэку забягаў Валодзя.

У тую раніцу, 26 мая 1942 года, у аптэцы было ўсё як звычайна. Толькі Георгій, крыху папрацаваўшы, некуды знік. Ніне сказаў: «Калі прыйдзе Валодзя, хай пачакае». Прыйшлі дзве сувязныя. Ніна перадала ім сетку са шрыфтамі. А праз паўгадзіны, расхваляваны, вярнуўся Георгій:

— Спакойна. Толькі што на вуліцы забіты Валодзя.

Ніна яшчэ не паспела апаматацца ад гэтай страшэннай весткі, да яе яшчэ не дайшла сутнасць таго, што адбылося, як у пакой уварваліся фашысты. Пачаўся вобыск. Потым іх сталі па аднаму выводзіць. У гестапа іх перапісалі, вывелі на двор і пачалу грузіць на машыну. Мужчынам загадалі легчы тварам да долу, трымаючы рукі перад сабой. На іх паклалі жанчын. Гестапаўцы сталі на жанчын і закрылі борт кузава.

Ехалі не доўга. Людзей, злоўленых гестапа, аказалася шмат. Усё турэмнае начальства высыпала на вуліцы, каб паглядзець на сваю «здабычу». Калі машына спынілася, Ніне ўдалося працiснуцца да Георгія. Выбраўшы зручны момант, ён схіліўся да дзяўчыны і прашаптаў: «Ты нічога не ведаеш!»

Па-ранейшаму ён заставаўся спакойным, стрыманым. Такім яго на ўсё жыццё і запомніла Ніна. Іх развялі па розных пакоях. Ніну — у сорак восьмы, Георгія — у дзевяноста сёмы. Пачаліся дні жудасных выпрабаванняў. Нібы дзве хвалі сутыкнуліся паміж сабой: адна— нечалавечыя катаванні фашыстаў, і другая — бязмежная любоў да Радзімы савецкіх людзей.

Пачаліся допыты. Фалевіча страшэнна збівалі. Да таго ж ён захварэў сыпным тыфам. Выздараўленне не радавала. Пераапранутыя гестапаўцы вадзілі яго па вуліцах, вымушалі доўга сядзець у скверы з надзеяй, што хто-небудзь яго пазнае і падыдзе. Так гестапа шукала новыя ахвяры. А Георгій жыў. Нават у тых нечалавечых умовах ён заставаўся верным сабе, верным сваім ідэалам. І ўсё думаў пра яе, пра Ніну. І таму можна ўявіць, як узрадаваўся ён, калі даведаўся, што сярод паліцэйскіх ёсць свой чалавек, што пры дапамозе яго можна трымаць сувязь з Ніной. Ніну з Міцем дапытвалі, але, як і Георгій, яны маўчалі. Неяк на допыце ім сказалі: «Ну што ж, пойдзеце дадому». Паверыць у гэта было немагчыма. Але гэта трэба было выкарыстаць як апошні шанс выйсці з турмы. І толькі пазней, значна пазней Ніна даведалася (Міця загінуў у партызанскім атрадзе), каму яна абавязана сваім жыццём. Немец, які вёў допыт, рускай мовы не разумеў, а перакладчыкам быў латышскі камуніст, спецыяльна засланы для работы ў гестапа...

Да турмы сталі часта наведвацца маці Георгія, Ніна. Ніна атрымлівала ад Георгія пісьмы.

«Сонейка маё! Чакаю сёння перадачы і таму вырашыў напісаць. У першых радках сардэчна дзякую за тытунь і цыгарэты. Па-другое, дзякую за перадачы. Ну мне, дарагая, ужо крыху лепш, праўда, слабасць страшэнная. Паверыш, хадзіць не магу і апетыт зверскі... Дарагая, у мяне да цябе просьба: у перадачы ўкладвайце свежую газету. Усё ж хочацца чытаць навіны. Зрабіце гэта! Мілая, мне сумна. Як мне хочацца бачыць цябе...».

Пісьмы, напісаныя на шматках парванай кашулі Георгія, поўныя чысціні і чалавечай прыгажосці.

«Я шчаслівы, што вы на волі. Цяпер мне памерці будзе лягчэй. Чакаю перадачы і смерці».

15 верасня, калі Ніна прыйшла з перадачай, ёй адказалі: «Павезлі, а куды — невядома». Больш пра Георгія звестак не было. Таму днём яго гібелі лічыцца 15 верасня. Так загінуў Георгій Фалевіч.

— Але для нас ён жывы,— працягвае размову далей Ларыса Уладзіміраўна.— Мы так зжыліся з вобразам Георгія, што ён нябачна прысутнічае сярод нас на кожным сходзе, кожнай сустрэчы. Мы яму давяраем самыя вялікія тайны, а калі стаім перад выбарам той ці іншай справы, заўсёды пытаем сябе: «А як бы зрабіў Георгій?»

**А. МАТУСЕВІЧ.**



НА ЗДЫМКАХ: Г. Г. Фалевіч; члены пошукавй групы хімфака разам з Н. А. Драздоўскай (Ярмоленка), Л. У. Вянжыцкай і Г. А. Лазерка.

● АНОНС ●

# КОМПЛЕКСНАЯ ПРАГРАМА

У НАШЫМ УНІВЕРСІТЭЦЕ даўно ўзята на ўзбраенне і дзейнічае комплексная праграма ідэйна-выхаваўчай работы са студэнтамі на пяцігадовы перыяд навучання. З мэтай укаранення навуковых асноў у практыку планавання, вызначэння эфекту і праверкі рэзультатаў, сродкаў, форм і метадаў ідэйна-выхаваўчай работы, яе сістэматызацыі, каардынацыі і далейшага ўдасканалення дзейнасці суб'ектаў навучання і выхавання студэнтаў рэктарат і партыйны камітэт прынялі нядаўна спецыяльную пастанову і зацвердзілі дадатковы варыянт «Праграмы». Рэкамендавана дэканатам, кафедрам, бюро партыйных, камсамольскіх і прафсаюзных арганізацый пры складанні перспектыўных планаў на год, а таксама аператыўных планаў вучэбна-выхаваўчай работы са студэнтамі кіравацца гэтай «Праграмай».

На днях «Праграма» выйшла з друку. Думаецца, што навукова абгрунтаваная, пераканаўчая па выкладанню, даступная па стылю і мове «Праграма», складзеная галоўным рэдактарам «Весніка БДУ» М. Д. Ціва, стане настольнай кнігай усіх педагогаў ВНУ, будзе надзейным арыенцірам у іх штодзённай працы.

**В. АРЭШАК.**

пісвае з падручніка абзацы-старонкі, выконваючы пры гэтым звычайную ролю капіравальнага апарата, то ўся яго работа (маецца на ўвазе не адзнака, а веды) — сізіфава праца. З другога ж боку — шпаргалка прыносіць пэўную карысць, калі ўяўляе сабой канспект, спалучэнне дэталёва прадуманых планаў-тэзісаў, каротkіх і трапных. У такім выпадку можна сказаць, што чалавек працаваў і засвоіў матэрыял.

А зараз пра тое, што лянуюцца. Будзе крывадушным сказаць, што гэта і не так. Сапраўды, куды прасцей «сарвацца» з лекцыі па сваіх справах, а потым «здуць» канспект у якой-небудзь руплівай аднакурсніцы.

Але мне хацелася б звярнуцца вось з такім пытаннем: ці ведае хто-небудзь з вас, колькі старонак тэксту патрэбна прачытаць яму перад сесіяй? Калі не лічылі, паспрабуйце. Запэўніваю: вы атрымаеце велізарную лічбу — недзе за 10 тысяч старонак. Уявіце, што вам неабходна ўсё гэта асэнсаваць, зрабіць выпіскі з даведнікаў, першакрыніц, мастацкіх твораў, падрыхтаваць рэфераты, курсавую, а для гэтага чытаць дадатковую літаратуру... Карацей, чытайце 10 тысяч старонак, або нешта каля паўмільёна радкоў, калі вы сумленны чалавек.

Студэнты часам не паспяваюць і фізічна не здольны запомніць увесь той неабсяжны аб'ём інфармацыі, веданне якой — на памяць! — ад іх патрабуецца на экзамене. Да таго ж, па кожнаму прадмету — свае заданні, і нагрузкі нярэдка выключна вялікія. Ёсць дзе не ў брыво, а ў самае вока пацэліў студэнцкі афарызм: «Без шпаргалкі ты — што коннік без сядла». «Непасільныя заданні толькі разбэшчваюць, прымушаюць нядобрасумленна адносіцца да сваіх абавязкаў», — пісала Н. К. Крупская.

Так паяўляюцца шпаргалкі. Так узнікае студэнцкая «штурмаўшчына». І яшчэ мы



маем падставу гаварыць, што шпаргалка — гэта сімптом таго, што сам працэс экзамена, у той форме, у якой ён зараз існуе, у нечым аджыў сваё. Неаднаразова пацвярджалася, што выкладчыку ў час сесіі даводзіцца выконваць не толькі ролю экзаменатара, але і другую, малапрыемную для яго і студэнтаў — наглядчыка.

«Наша сучасная сістэма кантролю (экзамены) з жорсткімі патрабаваннямі да памяці навучэнца страшыць больш за ўсё тым, што яна падаўляе элементарную цікаўнасць маладой істоты. Студэнты не толькі не цікаўныя людзі—яны як могуць адштурхоўваюць ад сябе любую інфармацыю. Выкладчык, паведамляючы ім дадатковыя звесткі, становіцца іх асабістым ворагам. І з пэўнай нагоды—ён жа павялічвае аб'ём таго, што патрэбна завучыць і «адбарабаніць» на экзамене. Зусім памылковым я лічу звычай (якім карыстаюцца амаль усюды) патрабаваць ад студэнта, каб ён адказваў на экзамене увесь матэрыял на памяць, без даведнікаў, канспектаў. Такі экзамен ператвараецца ў бязглуздую працэдуру, якая прыніжае абодва бакі...

З майго пункту гледжання ідэальным было б, каб студэнт у час выпрабаванняў, дапамагаючы сабе любымі крыніцамі ведаў, здолеў паказаць сваё ўменне выкарыстаць гэтую навуку для вырашэння рэальнай задачы. Іменна гэтага стане патрабаваць ад яго ў свой час жыццё!»

Гэты маналог, абмежаваны знакамі перадачы чужой мовы, належыць прафесару М. М. Завалішыну, аднаму з герояў кнігі І. Грэкавай «Кафедра».

Як бачыце, справы літаратурныя, а жыццё — зусім рэальнае.

## ● А КАЛІ ПАЧАЦЬ З КАНЦА!

ЯК СЦВЯРДЖАЕ навука інфарматыка, для трывалага засваення ведаў неабходна «ажыццявіць не менш за трыста зваротных сувязей». Іншымі словамі, студэнт павінен спрачацца, падаваць ідэі, абгрунтоўваць, проста размаўляць аб прадмеце, каб не забыцца на яго праз дзень пасля заліку.

Але ў час семестра спрачацца і размаўляць (я маю на ўвазе прадмет) студэнту ва ўсякім выпадку проста няма аб чым. Калі некаторыя выкладчыкі спадзяюцца, што студэнты вучацца ўвесь семестр, канспектуюць усё, што належыць, то гэта — наіўныя людзі. Асноўная маса вучыцца ў сесію, калі «прыціскае» час. За ноч вывучаецца матэрыял за ўвесь курс!

І так, а прапановы ёсць?

Ёсць!

Прапануе выкладчык Г. Грамыка з Обнінска:

«На першых жа занятках аб'яўляю, што пачнём мы з канца, гэта значыць з заліку. Вось вам спіс пытанняў, вось літаратура. Уся яна ёсць у інстытуцкай бібліятэцы. Праз тыдзень—кансультацыя, яшчэ праз тыдзень—залік. Праходзіць ён у форме вусных адказаў ля дошкі без падрыхтоўкі. Аб гэтым папярэджваю загадзя і, каб было не надта страшна, праводжу трэніроўку непасрэдна ў час кансультацый.

Здаюць добра, хаця і не ўсе з першага разу. А пасля па сутнасці і пачынаецца вучоба ў поўным сэнсе гэтага слова. Пасля «ўступнага» заліку мы можам проста пагутарыць. У нас ёсць аб чым і ёсць на гэта час...»

Яшчэ адна прапанова, таксама правераная практыкай. Сваім вопытам дзеліцца прафесар філіяла Днепрапятроўскага інжынерна-будаўнічага інстытута В. Шмігальскі:

«За 25 гадоў работы ў ВНУ я пераканаўся, што падручнікі ў 35—55 аўтарскіх аркушаў студэнты не чытаюць. Таму вырашыў выкласці свой курс наступным чынам: пытанне—кароткі адказ на яго. Першае выданне ў нашай ВНУ маёй работы па курсу «Дарожнабудаўнічыя матэрыялы» я зрабіў дзесяць гадоў назад. Увесь матэрыял па гэтай дысцыпліне змясціўся на пяці аўтарскіх аркушах. Кніга была распрададзена за тыдзень (мы разлічвалі, што яе хопіць на тры гады). Выявілася, што брашуры гэтыя купляюць студэнты будаўнічых спецыяльнасцей іншых ВНУ, выкладчыкі і працаўнікі вытворчасці...»

**Першае, што мне перш за ўсё не хочацца рабіць — ставіць кропку на гэтым месцы, як таго патрабуюць законы арфаграфіі. Не хацелася б абрываць размову (як мне здаецца, карысную, цікавую), пакінуўшы ў «сектары бачання» толькі іншыя інстытуты, факультэты, кафедры. Думаецца, што гутарку маглі б падтрымаць выкладчыкі, супрацоўнікі і студэнты нашага універсітэта.**

**Другое, што мне не хочацца рабіць зараз, калі нада мной дамоклавымі мячамі вісяць яшчэ два экзамены — гэта зноў пісаць «шпоры»...**

**В. ЧАРНЯЎСКІ,**
**наш кар.**

# Ружовы ранак

Літаратурная старонка

## НОВЫЯ ВЕРШЫ ЧЛЕНАЎ ЛІТАРАТУРНАГА АБ'ЯДНАННЯ «УЗЛЁТ»

АЎТАРЫ гэтых вершаў — ужо ўнукі тых салдат, што перамаглі на палях Вялікай Айчыннай вайны, што сорак гадоў таму назад гераічна вызвалялі з павуціння драпежнай свастыкі край, які стаў мірным краем іх нараджэння. Яны — у шарэнгах сённяшніх узлётаўцаў. У пачуццях, у памяці іх жыве, пульсуе, прадаўжае з іх прарастаць вершам тое, чаго ўзлётаўцы не бачылі ўласнымі вачыма, самі не перажылі.

Сёння мы друкуем некаторыя вершы з новай паэтычнай кнігі «Вусны», падрыхтаванай універсітэцкім літаб'яднаннем «Узлёт» да 40-годдзя вызвалення Беларусі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў.

Алег ЛОЙКА,
кіраўнік літаб'яднання
«Узлёт», прафесар.

**Алена СТОРАЖАВА**

### СЦЕЖКА ПРАЗ ЖЫТА

*Лецейка, лета,*
*сонцам умытае,*
*Люба мне крочыць*
*сцежкай праз жыта.*
*Неба чысцюткае,*
*мора нібыта,*
*Цешыцца, лашчыцца,*
*плешчацца жыта.*
*Шчокі казыча*
*калоссе налітае,*
*Шэпча мне нешта*
*адвечнае жыта.*
*Ды — быццам глухну ўраз*
*несамавіта,*
*Нібы заміраю між вечнага*
*жыта:*
*У вочы глядзяць мне*
*жыцці непражытыя —*
*Імёны палёгшых*
*за роднае жыта.*
*Нізка хілю*
*галаву непакрытую*
*Прад абеліскам,*
*прад вечным жытам.*



Ілюстрацыі студэнта біяфака Ігара Бышнева.

**Міхась КАРПЕЧАНКА**

### КАБ ВАЛОДАЎ ПЭНДЗЛЕМ

Каб я хоць крышачку
Валодаў пэндзлем
І мог адрозніваць
Дваццаць
мільёнаў
адценняў
чорнага колеру,
Я б намаляваў тваё гора,
Вайна!..

**Алена ЗАБАРОНАК**

Мясцін маіх
Прыгожы сон,
Хваін густых
Зямны паклон.
Маіх дзядоў
Бяжыць рака,
Як продкаў кроў,
Цячэ ў вяках.
Удалеч памяць
Пазаве,
Як сонца, вабіць даль,
Плыве.
Пакліча маці...
Мне б паспець
На ўзгорак стаць і...
Паглядзець!
І памаўчаць:
Што за прамень
Бліснуў! Гучаць
Пачаў мой дзень.
Ціхутка, тонка
Я пяю:
«Усёй старонкай
Родную!»



### НА АДЛЁТ ЖУРАВОЎ

Заклінаннем неба —
Вырай жураўліны
Затуманіў вочы
Восеньскаму дню.
Цішыня Хатыні
Ўслед яму махае
Хустачкай пунсовай
Вечнага агню.

І таму я сёння,
Як і ты, мой краю,
Сумны, зажурбелы
Жураўліны крык.
Край мой,
Ваша светласць —
Родныя Крыніцы
І Высокасць Ваша —
Родныя бары!

Тут жар-птушкі шчасце
І жах-птушкі болю,
Край мой, палымнелі
У тваім ваччу, —
Хвалямі вось гэтых
Рэшткі, мной апеты,
І ў зямлю абмытым
Тут сысці хачу!

Толькі б мне пакінуць,
Толькі б мне пакінуць,
Бы ралля, глыбокі
За сабою след.
На табе адзіным,
Край спакон жаданы,
Жураўліным клінам
Мне сышоўся свет!

**Станіслаў ВАЛОДЗЬКА**

### СЛОВА НА ПРОВАДАХ

Каб не ўпала болей неба,
Як сорак год таму даўно,
Сляпым дажджом свінцу
і снегам,
Пякучым снегам —
Сівізной
Матулям нашым на галовы,
Вось і табе прыйшла пара
Вялікай дружбаю салдацкай
Над намі неба падпіраць!
Сваю нялёгкую дарогу,
Як скатку, несці да пары,
Каб мог спакойна люльку міру
Дом матчын ранніцай курыць,
Каб падаў дождж, сляпы
ад шчасця,
І снег — вясёлай навіной
І каб не ўпала неба долу,
Як сорак тры таму —
вайной!



**Леанід ТРУБАЧ**

### УСПАМІН ВЕТЭРАНА

Пясок і пыл. Грукочуць тракі,
Ірвуць з пяском маўклівую траву.
А колькі іх было—атак да той атакі,
Што і свінцом, і беллю засыпала галаву?!.

Адна граната, бы кавалак хлеба,
Счарсцвелы і апошні — у галодны год.
Адно—адзінае рашэнне: «Гэтак—трэба:
Я і адзін—полк, рота, ўзвод!..»

То не гранаты — сэрца выбух,
Не пералічаны на мегатоны,—
«Тыгр» — змоўк... «Я ці хто іншы
з полымя выбег?..»
Дасюль над ветэранам хмары, як пантоны.

Не наталіцца сустрэчай адзінай:
Пяшчота вачэй—невычэрпнасць крыніцы.
Маці дарэмна гукае дзяўчыну:
Вусны да вуснаў—як не спазніцца?!.

Ды—не спазніліся...
Голас дрыжыць...
Абеліск... Цень крыла буслянога
з-пад ліпы...
Як жа хацелі кахаць яны, жыць...
Лепш бы ты, бусел, з крыніц іх
давыпіў!..

**Вольга САВАСЦЮК**

### ЗНОЎ СТАЮ ЛЯ АБЕЛІСКА...

**Зноў стаю ля абеліска,**
**Ціха прозвішчы чытаю,**
**Галаву схіліўшы нізка,**
**Слёзы моўчкі аціраю.**

**Колькі часу праляцела,**
**Ты ж, дзядуля мой, не дома.**
**Я ўжо вырасці паспела,**
**А табе і невядома!..**


БЕЛАРУСКІ УНІВЕРСІТЭТ

Ордэна Працоўнага Чырвонага Сцяга друкарня выдавецтва ЦК КПБ.

21 чэрвеня 1984 г.

АТ 07742 Зак. 1062.

220080, МІНСК-80, УНІВЕРСІТЭЦКІ ГАРАДОК, ГЕАГРАФІЧНЫ КОРПУС, п. 3.

ТЭЛЕФОН 20-68-27.

Рэдактар В. П. ВАРАБ'ЁЎ